8. *Леонтьев, К. Н.* Письма отшельника / К. Н. Леонтьев // Собр. соч. : в 9 т. – М. : тип. В. М. Саблина, 1913. – Т. 5.

9. *Леонтьев, К. Н.* Племенная политика как орудие всемирной революции / К. Н. Леонтьев // Собр. соч. : в 9 т. – М. : тип. В. М. Саблина, 1913. – Т. 6.

10. *Леонтьев, К. Н.* Православие и католицизм в Польше / К. Н. Леонтьев // Гражданин. – 1882. – № 101.

11. *Леонтьев, К. Н.* Русские, греки и юго-славяне. Опыт национальной психологии / К. Н. Леонтьев // Собр. соч. : в 9 т. – М. : тип. В. М. Саблина, 1913. – Т. 5.

12. *Михеев, В. М.* Идеология : размышления и выводы / В. М. Михеев. – Минск : Тонпик, 2004. – 316 с.

13. *Соловьев, В. С.* К. Н. Леонтьев / В. С. Соловьев // Энцикл. слов. Ф. А. Брокгауза и И. А. Ефрона : в 86 т. – СПб., 1896. – Т. 34. – С. 562–564.

14. *Тихомиров, Л. А.* Русские идеалы и К. Н. Леонтьев / Л. А. Тихомиров // Русское обозрение. – 1894. – № 10.

*V. MIKHEEV*

## THE CULTUROLOGY OF K. LEONTIEV: THE TRIUNE FORMULA OF DEVELOPMENT

*The article is devoted to the analysis of the theoretical heritage of the Russian culturologist of the second half of the XIX century, K. Leontiev, and his contribution into social and philosophical thought of Russia.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 08.08.2013.

УДК 165.62:821.161.3.09 Колас

*В. І. ВЯРБІЦКАЯ*

## ФЕНАМЕНАЛОГІЯ ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

*Прааналізаваны падыходы да разумення інтэнцыянальнасці ў тэарэтыка-метадалагічных працах Э. Гусэрля. Выказана меркаванне аб фенаменалагічным тыпе творчасці класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Вызначана паняцце «этнакультурная інтэнцыянальнасць», увасобленае ў творчай спадчыне народнага паэта.*

Уяўленні аб культуры абумоўліваюцца тым, як яе суб’екты імкнуцца ўбачыць, даследаваць і асэнсаваць тыя ці іншыя з’явы, якія ў іх свядомасці атаясамліваюцца са светам культуры. У розных галінах гуманітарных ведаў культура разумеецца спецыфічна, у адпаведнасці з мэтай і задачамі канкрэтнай навукі.

Культуралагічнае ўяўленне аб культуры адрозніваецца ад звычайнага тым, што яно звязана з неабходнасцю вызначэння сутнасці, зместу і сэнсу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай фундаментальнай сферы чалавечага быцця. Заснавальнік фенаменалогіі Э. Гусэрль сцвярджаў, што сэнс свету не даецца нам звонку: «неазначальна агульны сэнс свету і азначальны сэнс яго кампанентаў ёсць нешта, што мы разумеем у працэсе ўспрымання, мыслення, ацэнкі жыцця, гэта значыць нешта "канстытуяванае" ў тым ці іншым суб'ектыўным генезісе»* [4, с. 17]. Але ў выпадку, калі свет нам дадзены з дапамогай свядомасці, тлумачыць філосаф, то непасрэдна нам даецца свядомасць, а не сам свет.

Для надання сэнсу прадмету Э. Гусэрль выкарыстоўвае паняцце *інтэнцыянальнасць* (ад лац. intentio – імкненне), якое ў XIX ст. у нямецкую філасофію ўвёў Ф. Брэнтана. Дадзенае паняцце выкарыстоўвалася філосафам у якасці крытэрыю для выяўлення псіхічных і фізічных феноменаў. У канцэпцыі Ф. Брэнтана «інтэнцыянальнасць» азначала прадметнасць усякага акта свядомасці, абавязковае аднясенне яго да пэўнага – рэальнага ці ўяўнага – прадмета. Э. Гусэрль у адрозненне ад Ф. Брэнтана разглядае інтэнцыянальнасць як накіраванасць свядомасці на прадметы, адносіны свядомасці да прадметаў. Пад ёй філосафам разумелася ўласцівасць перажывання быць «свядомасцю чаго-небудзь»: «Успрыманне ёсць успрыманне нечага, напрыклад, рэчы; меркаванне ёсць меркаванне аб якім-небудзь становішчы спраў; ацэньванне – ацэньванне якой-небудзь каштоўнаснай сітуацыі; жаданне – жадаемых абставін і г.д.» [2, с. 184]. Паводле Ф. Брэнтана, не ўсё, што адносіцца да сферы псіхічнага, інтэнцыянальна. Так, прадметна інтэрпрэтуюцца адчуванні. Структура перажывання не залежыць, на думку Э. Гусэрля, ад таго, рэальны ці нерэальны прадмет свядомасці. У агульным выглядзе структура інтэнцыянальнасці ўяўлялася філосафам як адрозненне і адзінства інтэнцыянальнага акта, зместу і прадмета.

У Э. Гусэрля інтэнцыянальнасць – гэта напоўненасць свядомасці і характарыстыка першаснай прысутнасці свету ў яго цэласнасці да магчымага сінтэзу аналітычных момантаў, якія выяўляюцца ў ім. Інтэнцыянальнасць трактавалася філосафам як адкрытасць суб'екта свету, сапраўдная суб'ектыўнасць. Да прадметных актаў свядомасці ён адносіў: аперцэпцыю, успамінанні, фантазіі, жаданні, формы мыслення і рэфлексіі. Па яго меркаванні, яны вызначаюцца адпаведным прадметным зместам [3, с. 184].

Для апісання агульнай структуры інтэнцыянальнасці Э. Гусэрль уводзіць тэрміны з антычнай філасофіі «ноэзіс» (мысленне) і «ноэма» (думка) [2]. Ноэтычныя кампаненты перажывання характарызуюць накіраванасць свядомасці на прадмет як акт надання сэнсу. Сумесна з пачуццёвым матэрыялам яны ўтвараюць прадмет пэўнага аналізу, у якім перажыванне паўстае як варыяцыя, плынь фенаменалагічнага быцця з яго актуальнымі і патэнцыяльнымі фазамі. Ноэма – прадметны сэнс, які дасягаецца ў акце свядомасці. Фенаменалагічнае апісанне, паводле Э. Гусэрля, мае два напрамкі: апісанне акта перажывання (ноэтычнае) і апісанне таго, што перажываецца (ноэматычнае). Інтэнцыянальны аналіз накіроўваецца на ноэматычны карэлят акта (ноэму) – прадметны сэнс, а таксама на ўстойлівае

---

* Цытаты прыводзяцца ў перакладзе аўтара артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзінства сэнсавых слаёў прадмета. Філосаф сцвярджаў, што для тварца галоўнае не свет ці яго частка, а сэнс свету. І гэты свет канстытуецца ў адпаведнасці з пэўным модусам перажывання, тыпам інтэнцыі ці накіраванасці на прадмет [2, с. 60].

У залежнасці ад тыпу інтэнцыі (ацэнка, любоў, нянавісць, пазнанне, страх, уяўленне, чаканне, фантазіраванне і інш.) канстытуецца інтэнцыянальны прадмет. Яго сэнс, ці ноэму, карэлятыўную сувязь яе і ноэзіса павінен устанавіць і раскрыць прапаноўваемы Э. Гусэрлем інтэнцыянальны аналіз свядомасці.

Метад фенаменалагічнай рэдукцыі і рэфлексіі, які прапанаваў Э. Гусэрль, дазволіў даследчыкам дыферэнцыраваць агульную плынь свядомасці, вылучыць яе розныя ўзроўні, інтэнцыянальнасць, накіраванасць на той ці іншы прадмет. Для дасягнення мяжы верагоднасці Э. Гусэрль «браў у дужкі» (эпахе) усё, што мае прамыя ці ўскосныя адносіны да «натуральнага» ўяўлення быцця. Філосафам «у дужкі» браліся (рэдуцыраваліся) і свет, і першапачатковыя непасрэдныя ўспрыманні, і перажыванні, і «наіўна зацікаўленае Я», ці натуральная рэфлексія. Аналізуючы інтэнцыянальны рух свядомасці, Гусэрль рэканструяваў свет незалежна ад фактычнай сітуацыі. У гэтай сувязі ён адзначаў: «Мы прывыклі засяроджваць увагу на прадметах, думках і каштоўнасцях, але не на псіхічным “акце перажывання”, у якім яны разумеюцца» [4, с. 14].

Такім чынам, Э. Гусэрль распрацаваў маштабную праграму інтэнцыянальнага аналізу спантаннай свядомасці і спантаннай чалавечай дзейнасці, у якой сэнсы не тэматызуюцца, не з’яўляюцца прадметам спецыяльнай увагі, і толькі фенаменалагічная «інтуіцыя сутнасцей» здольна, паводле філосафа, раскрываць іх і паказваць, як інтэнцыянальная структура прадмета суадносіцца са спецыфікай модусаў яго перажывання. На мяжы XIX–XX стст. Э. Гусэрль абгрунтаваў новую метадалогію філасофскага, і перш за ўсё сацыякультурнага, пазнання. Культура не толькі цэнтральны сэнсаўтвараючы элемент яго канцэпцыі, але дынамічны адкрыты для будучыні сэнсавы пачатак чалавечага быцця. Да ўзнікнення фенаменалогіі лічылася, што ўяўныя феномены, рэальныя і несапраўдныя, рацыянальныя і ірацыянальныя, масавыя і элітарныя, паўсядзённыя і трансцэндэнтальныя не маюць культурнага сэнсу. З пункту ж гледжання фенаменалогіі ўсе яны з’яўляюцца рэаліямі свядомасці і ў якасці такіх уваходзяць альбо ў актуальны, альбо ў патэнцыяльны свет культуры, а гэта значыць валодаюць культурным сэнсам.

З’яўленне фенаменалогіі дазволіла даследчыкам інакш усведамляць месца і ролю культуры ў грамадстве. Раней культура разглядалася як неабавязковы элемент соцыуму, вытворны ад ідэалогіі, палітыкі, эканомікі і іншых сацыяльных рэалій. Фенаменалогія вызваліла культуру ад гэтай прымітыўнай залежнасці. Культура стала паўнавартасным аб’ектам навуковага даследавання.

Метад Э. Гусэрля быў не толькі станоўча ўспрыняты і выкарыстаны ў гуманітарных навуках, але арыгінальна і творча развіты пазнейшымі філосафамі, культуролагамі, сацыёлагамі: М. Хайдэгерам, М. Шэлерам, Ж.-П. Сартрам, М. Мерло-Панці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Паслядоўнікамі Э. Гусэрля былі П. Бергер, М. Бярдзяеў, Г.-Г. Гадамер, М. Гартман, Ж. Лакан, Ж. Дэлёз, Ж. Дэрыда, Р. Інгардзен, Ж. Лакан, Ж.-Ф. Ліатар і інш.

Фенаменалогія як адзін з напрамкаў навуковага падыходу да аналізу культуры не страціла і сёння актуальнасці сярод метадалагічных пошукаў у галіне айчыннай культуралогіі. Аналіз сутнасці і зместу інтэнцыянальнасці як шматзначнага тэрміна гуманітарных навук утрымліваецца таксама ў тэарэтыка-метадалагічных працах беларускіх філосафаў У. Конана, М. Мажэйкі, В. Пазнякова, А. Філіповіча, якія інтэрпрэтуюць яго як імкненне, увагу суб'екта культуры да рэфлексіўнага асэнсавання пэўных працэсаў і з'яў рэчаіснасці.

Падсумоўваючы, можна сцвярджаць, што фенаменалогія з моманту ўзнікнення садзейнічала змене традыцыйных уяўленняў аб чалавеку і яго месцы ў свеце. Метад фенаменалагічнай рэдукцыі стаў эфектыўным спосабам пранікнення ў глыбіні экзістэнцыяльных патэнцый. Фенаменалагічная праблематыка атрымала сваё развіццё і ў культуралогіі. Выяўленне кантэкстаў сувязі суб'екта культуры са светам, знаходжанне асноў суб'ектыўных і аб'ектыўных бакоў рэчаіснасці, пераацэнка артэфактаў культуры – кропкі перасячэння фенаменалогіі і культуралогіі. Асабліва прадуктыўны фенаменалагічны аналіз пры даследаванні тэкстаў культуры.

Вопыт даследавання тэкстаў культуры паказвае існаванне неадназначных ацэнак, асэнсаванне якіх спараджае дыскурс. Перш за ўсё неабходна ўстаноўка на «невымоўнае», якое яўна не прысутнічае ў аналізуемым тэксце культуры, тое, што не выяўляецца пры першасным успрыманні, але з'яўляецца падмуркам, на якім фарміруюцца сэнсы. Наступны крок – гэта суаднясенне тэксту з культурным досведам, пошук у ім аналагічнага ці алагічнага, рыс, якія ідэнтыфікуюць рэцыпіента, суадносяць яго і іншага. Нарэшце, неабходна звярнуцца да вопыту стваральніка тэксту, яго думак, пачуццяў, эмоцый, перажыванняў, сэнсаў, сімвалаў, якія ён праз тэкст аддаў свету. Працэс дэканструкцыі тэксту культуры, які адбываецца на працягу аналізу, павінен завяршыцца канструяваннем новага тэксту, асновай якога з'яўляюцца не толькі зрокавыя канстанты, але і глыбінныя псіхалагічныя і культуралагічныя асновы чалавечага быцця.

Фенаменалогія культуры зыходзіць з таго, што законы культуратворчасці вельмі індывідуальныя. Руская фенаменалагічная школа вылучала ў мастацкай творчасці два тыпы: ідэалагічны і фенаменалагічны. Фенаменалагічны тып творчасці прадугледжвае поўнае духоўнае перажыванне, якое прысутнічае ў актах інтэнцыі, у разнастайных відах «свядомасці аб нечым», заснаваных на жывым, інтэнсіўным і непасрэдным кантакце са светам. Таму сэнс у ходзе фенаменалагічнага сузірання паўстае не абстрактна, а як унутрана ўласцівы прадмету, яго інтымнае. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў чыстым выглядзе названыя тыпы, на наш погляд, нідзе і ні ў кога не сустракаюцца.

Культуралагічнае даследаванне творчай спадчыны Якуба Коласа дае падставу сцвярджаць, што ў тэкстах яго мастацкіх і публіцыстычных твораў прысутнічае як фенаменалагічны, так і ідэалагічны тып творчасці. Аналіз тэкстаў паэм «Сымон-музыка», «Новая зямля», «Рыбакова хата»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трылогіі «На ростанях», зборніка алегарычных апавяданняў «Казкі жыцця», шэрагу вершаў [5] сведчыць, што ў іх пераважае фенаменалагічны пачатак. Суб'ектыўнасць паэта ў гэтых і іншых творах не толькі сугучна лірычнаму прынцыпу, яна нясе перакананне (у аснове фенаменалагічнае) у зліцці, адзінстве суб'екта і аб'екта. Карціны прыроды і вобразы людзей пераважаюць над ідэалагічнымі пошукамі. Праз індывідуальнае ўспрыманне з'яў прыроды пісьменнік выказвае філасофскі погляд на свет і чалавека, на ўзаемасувязь прыроды і чалавека. Вобразы прыроды ў яго творах маюць вялікі сэнсава-эмацыянальны кантэкст, ствараюць глыбокі ўнутраны падтэкст. Каб спасцігнуць сутнасны пачатак свету, Я. Колас прыкладае глыбокія духоўныя і інтэлектуальныя намаганні. Так, у «Казках жыцця» паэт імкнецца мастацкімі сродкамі адкрыць чытачу ў прыродным свеце найбольш агульныя і значныя анталагічныя законы, у тлумачэнні якіх судакранаюцца іманентныя і трансцэндэнтныя грані быцця. Шматлікія фрагменты апавяданняў кнігі, дзе творчасць пісьменніка скіравана супраць рацыяналістычнай карціны свету, можна лічыць свайго роду мастацкай фенаменалогіяй. У іх прысутнічае фенаменалагічны культ непаўторнасці, разнастайнасці кожнай з'явы прыроды: сонца, балота, леса, дрэва, ручая, гары, вады, агню і інш. Вобразы ў Коласа шматзначныя і ўніверсальныя, яны ў значнай ступені характарызуюць усю сістэму адлюстравання нацыянальнага свету беларусаў. Вядомы коласазнаўца А. І. Бельскі лічыць, што «Я. Колас – адкрывальнік беларускай этнапрасторы, беларускага вобраза свету, <…> сваёй творчасцю паэт сфарміраваў нацыянальнае пачуццё прыроды» [1, с. 35]. У пейзажныя карціны і малюнкі паэт уклаў глыбокую эстэтыку мастацкага слова, змест свайго Я.

Прырода ў коласаўскіх творах нясе выразны інтэнцыянальны змест, які пазначаны імкненнем паэта зразумець складанасць і плыннасць чалавечага жыцця, суадносіны часовага і вечнага, прыгожага і брыдкага. На наш погляд, пісьменнік разважае жыццёва-іманентна, як бы з нутра самога жыцця. Асабліва гэта праяўляецца ў вырашэнні праблемы месца чалавека на зямлі. У трылогіі «На ростанях», паэмах «Новая зямля», «Сымон-музыка» і іншых творах Я. Колас звяртаецца да звышпрыроднага, сакральнага, што не дадзена чалавеку ў яго адчуваннях. Пры гэтым рацыянальна-лагічны падыход нярэдка спалучаецца з інтуіцыяй, маштабнымі абагульненнямі, фантазіяй і сімваламі. Як у паэзіі, так і ў коласаўскай прозе выразна праяўляецца эстэтыка падсвядомых, інтуітыўных форм мыслення і творчасці. Коласаўскі мастацкі свет не столькі адбітак знешняга свету, колькі вынік унутраных, суб'ектыўных намаганняў асобы пісьменніка. Творчая спадчына паэта акумулюе этнанацыянальныя мадэлі светабачання, утрымлівае тыповыя для культуры беларусаў падыходы да разумення чалавека, прыроды, соцыуму, задае рэцыпіенту нацыянальныя каардынаты мыслення і абумоўлівае нацыянальна-спецыфічны характар індывідуальнага і калектыўна-народнага светаўспрымання. У шэрагу мастацкіх і публіцыстычных твораў Я. Колас раскрывае ментальна-псіхалагічныя адметнасці беларусаў, сутнасць іх псіхаэмацыянальнай і каштоўнасна-светапогляднай непаўторнасці. Для коласаўскага фенаменалагічнага светабачання прыкметамі беларускай ментальнасці з'яўляюцца адкрытасць свету прыроды, умен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не быць у згодзе з ім і ў суладдзі з жыццём наогул, разважлівасць, стрыманасць, спагадлівасць, самаахвярнасць, талерантнасць.

Культуралагічны аналіз коласаўскай індывідуальна-аўтарскай канцэпцыі, якая адлюстроўвае адметнасці беларускай этнапрасторы, беларускага вобраза свету, нацыянальнага характару беларусаў, іх псіхікі і ладу мыслення, дазваляе нам гіпатэтычна выказаць меркаванне аб наяўнасці ў творчай спадчыне Я. Коласа этнакультурнай інтэнцыянальнасці. Пад ёй маецца на ўвазе накіраванасць свядомасці Я. Коласа на асэнсаванне феноменаў нацыянальнай культуры і індывідуальна-непаўторных светапоглядных рыс беларусаў як суб'ектаў гэтай культуры. Прадметам рэфлексіі, медытацыі і суджэнняў пісьменніка з'яўляюцца: праблемы культурнай памяці ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння; працэс інкультурацыі асобы беларуса; культура сялянства і інтэлігенцыі; аб'екты духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Такім чынам, фенаменалагічны падыход дазваляе выявіць вытокі творчасці Я. Коласа, разуменне, прадчуванне ім сутнасных працэсаў і з'яў нацыянальнай культуры беларусаў, пранікнуць ва ўнутраны, суб'ектыўны свет пісьменніка.

1. *Бельскі, А. І.* Эстэтычныя і філасофскія погляды Якуба Коласа на прыроду / А. І. Бельскі // Каласавіны : матэрыялы навук. канф. «Праблемы рацыянальнага выкарыстання і захавання прыродных ландшафтаў мемарыяльных музейных аб'ектаў», 1998 / Дзярж. літ.-мемар. музей Я. Коласа ; прац.: М. Н. Далідовіч [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 34–41.

2. *Гуссерль, Э.* Идеи к чистой феноменологии и феноменологической философии : пер. с нем. / Э. Гуссерль. – М. : Акад. проект, 2009. – Кн. 1 : Общее введение в чистую феноменологию. – 489 с.

3. *Гуссерль, Э.* Кризис европейского человечества и философии / Э. Гуссерль // Философия как строгая наука : пер. с нем. / Э. Гуссерль. – Минск : Харвест ; М. : АСТ, 2000. – 743 с.

4. *Гуссерль, Э.* Феноменология / Э. Гуссерль // Логос. – 1991. – № 1. – С. 14–37.

5. *Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. ; рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Мастац. літ., 1972–1978. – 14 т.

*O. VIARBITSKAYA*

## THE PHENOMENOLOGY OF YAKUB KOLAS'S CREATIVITY

*Approaches to the understanding of intentionality in theoretical and methodological works of foreign and domestic researchers are analyzed. The hypothesis about the phenomenological type of creativity of the Belarusian classicist Yakub Kolas is expressed. The concept of ethno-cultural intentionality, embodied in the artistic heritage of the national poet is defined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 12.09.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ